# Наш край у перыяд Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага

1. Складзіце спіс крыніц, з якіх можна пачэрпнуць інфармацыю пра гістарычнае развіццё вашай мясцовасці ў другой палове XIII — XV ст.

2. Якія артэфакты, што адносяцца да Позняга сярэднявечча, захоўваюцца ў краязнаўчых музеях вашай мясцовасці? Пра што яны сведчаць?

3. Вывучыце, якія звесткі змяшчае кніга «Памяць» вашага раёна пра развіццё мясцовасці і жыццё яе насельніцтва ў другой палове XIII — XV ст. Прэзентуйце знойдзеную інфармацыю ў адной з формаў: інфаграфіка, ментальная карта, калаж, плакат і г. д.

4. Карыстаючыся картасхемамі вучэбнага дапаможніка, картамі атласа або насценнымі картамі, вызначце:

А. Калі і якім шляхам рэгіён, дзе вы жывяце, быў далучаны да Вялікага Княства Літоўскага?

Б. Якія значныя ўнутрыпалітычныя падзеі адбываліся на тэрыторыі вашай мясцовасці ў другой палове XIII — XV ст.?

В. Якія гандлёвыя шляхі праходзілі праз ваш рэгіён? У якіх формах ажыццяўляўся гандаль? Якія тавары пастаўлялі на рынак мясцовыя рамеснікі?

Г. З якімі знешнімі ворагамі маглі змагацца жыхары вашай мясцовасці ў другой палове XIII — XV ст.? Даведайцеся, ці здолелі яны ім супрацьстаяць.

5. Ахарактарызуйце этнічны і канфесійны склад насельніцтва вашага рэгіёна ў другой палове XIII — XV ст. Якія падзеі паўплывалі на яго фарміраванне?

6. Адначасова з этнічнымі саманазвамі існавалі і мясцовыя назвы, якія, як правіла, абазначалі прыналежнасць да таго ці іншага населенага пункта, пэўнай мясцовасці. Як называлі сябе жыхары вашага рэгіёна ў XIV–XV стст.?

**7.** Выкарыстоўваючы кнігу «Памяць» вашага раёна і іншую літаратуру, ахарактарызуйце асаблівасці побыту жыхароў вашага рэгіёна паводле плана: заняткі, жыллё, адзенне, кухня, абрады і традыцыі. Ці захаваліся нейкія элементы паўсядзённага жыцця і духоўнай культуры таго перыяду да нашых дзён?

**8.** Якія архітэктурныя збудаванні другой паловы XIII — XV ст. знаходзяцца ў вашым рэгіёне? Складзіце турыстычны маршрут і рэкламную ўлётку (флаер) з запрашэннем наведаць гістарычныя славутасці вашага рэгіёна.